# З ГІСТОРЫІ ТРАНСПАРТНЫХ І ПРАМЫСЛОВЫХ АКЦЫЯНЕРНЫХ ТАВАРЫСТВАЎ БЕЛАРУСІ (20–50-Я ГГ. XIX СТ.)

Ерашэвіч А.У. г. Мінск, БДЭУ

Акцыянерныя таварыствы як карпаратыўны юрыдычны суб'ект па акумуляцыі грашовых сродкаў, інстытут і арганізацыйна-прававая форма ажыццяўлення прадпрымальніцкай гаспадарчай дзейнасці вядомы ў Расійскай імперыі з XVIII ст. Аднак толькі да першай трэці XIX ст. адносіцца заканадаўчае рэгуляванне дзейнасці акцыянерных кампаній, вызначэнне ўмоваў іх дзейнасці, маёмасных правоў і абавязкаў акцыянераў і акцыянернага таварыства. Асноўныя прававыя асновы функцыяніравання акцыянерных таварыстваў былі замацаваны ў двух нарматыўных актах. У маніфесце ад 1.01.1807 г. "О даровании купечеству новых выгодах, отличиях, преимуществах и новых способах к распространению и усилению торговых предприятий" [8, т. 29, № 22418, с. 971–979] абвяшчалася аб магчымасці стварэння 4-х форм гандлёва-прамысловых аб'яднанняў (поўнага таварыства, таварыства на веры, акцыянернага таварыства ці таварыства на паях і арцельнага таварыства), замацоўваліся некаторыя асноўныя прынцыпы іх заснавання і дзейнасці (абмежаваная адказнасць акцыянераў, магчымы ўсесаслоўны склад пайшчыкаў, так званы, дазвольны прынцып заснавання толькі пасля высачайшага зацвярджэння ці з дзяржаўнай санкцыі). Характэрныя рысы арганізацыйна-прававой формы акцыянернага таварыства рэгламентаваліся ў зацверджаным імператарам 6. 12. 1836 г. палажэнні аб акцыянерных кампаніях [9, т. 11-2, № 9763, с. 257–266]. У гэтым заканадаўчым акце, нормы якога выкарыстоўваліся да 1917 г., фіксаваліся асноўныя прынцыпы фарміравання і функцыяніравання акцыянерных таварыстваў (адзіны памер уклада, які прыходзіцца на акцыю, прыватны характар укладаў, наяўнасць адзінага пастаяннага капітала, абмежаваная адказнасць акцыянераў па абавязацельствах, канцэсійная ці дазвольная сістэма заснавання акцыянерных кампаній) [падрабязней 10, с. 393–409; 8, с. 36–58].

Заўважым, што адной з асаблівасцяў акцыянернага заканадаўства першай паловы XIX ст. была, так званая, практыка сепаратнага заканадаўства, калі нормы і правілы пры стварэнні

асобных акцыянерных кампаній не заўсёды суадносіліся з агульнарасійскімі.

З пачаткам прамысловага пераварота і першапачатковага накаплення капітала ў Расійскай імперыі актывізаваўся працэс стварэння акцыянерных кампаній. У той час акцыянерныя таварыствы як форма прадпрымальніцкай актыўнасці, ініцыіраваная дзяржаўнай падтрымкай, лічыліся адной з прыдатных формаў і спосабаў вытворчага размяшчэння свабодных прыватных капіталаў, крыніцай іх фарміравання, назапашвання і наступнага фінансавання (інвесціравання) праектаў. Таму зразумела, што акцыянерныя кампаніі атрымлівалі дзяржаўныя льготы і прывілеі. Прадугледжвалася магчымасць укладаў для ўсіх жадаючых, а сярод іх заснавальнікаў у першай трэці XIX ст. часта заўважаліся саноўнікі, прадстаўнікі ваеннай эліты, чыноўніцкай бюракратыі. Акцыянерныя таварыствы выступалі як грамадскія інстытуты – канкурэнты манапольнай дзяржаўнай фінансава-крэдытнай сістэмы, накіраванай у асноўным для фінансавання дэфіцытаў даходнай часткі бюджэта і задавальнення інтарэсаў і патрэбаў памешчыцкага землеўладання. Акцыянерныя таварыствы сталі адной з формаў канцэнтрацыі і цэнтралізацыі капіталаў для іх капіталаўкладанняў у сферах прамысловасці, транспарту (будаўніцтва чыгунак, суднаходства), страхавой справе, пазней – у крэдытнай сістэме.

У 1807–1829 гг., у дадатак да 5 існуючых, у Расійскай імперыі было заснавана 19 акцыянерных таварыстваў, у 1830–1836 гг. створана 30 акцыянерных кампаній [10, с. 308–315]. Да 1836 г. каля паловы акцыянерных таварыстваў дзейнічалі ў Пецярбургу, каля 25% – у Адэсе. Па звестках расійскага гісторыка Л. Шапялёва, у 1837–1856 гг. у Расійскай імперыі было абвешчана аб фарміраванні 74 акцыянерных кампаній (5 з іх не былі заснаваны, а 22 былі ліквідаваны), у тым ліку, 14 суднаходных, 9 страхавых, 13 тэкстыльных, 8 цукровых, 7 па апрацоўцы прадуктаў жывёлагадоўлі, 3 горных, 20 іншых [11, с. 63, 64]. Адзначым, што на працэс стварэння акцыянерных таварыстваў, акрамя іншых фактараў, уплывалі змены ў стаўках працэнтаў па дэпазітным укладам. У 1830 г. гарантаваны даход па дэпазітах у дзяржаўных банкаўскіх установах звычайна складаў 4% гадавых, а нестабільныя дывідэнды ў акцыянерных таварыствах – 8–10%. Пасля зніжэння ў 1857 г. працэнтаў па ўкладам пачаўся адток свабодных капіталаў у

акцыянерныя таварыствы. У 1856–1860 гг. было абвешчана аб заснаванні 101 акцыянернай кампаніі (94 гандлёва-прамысловых, 1 крэдытнай, 6 чыгуначных), аднак 10 з іх так і не былі створаны, а 23 былі ліквідаваны [11, с. 66].

На тэрыторыі Беларусі ў 20-50-я гг. XIX ст. дзейнічалі (рэальна і намінальна) некалькі акцыянерных кампаній: сельскагаспадарчая (Беларускае вольнае эканамічнае таварыства ў Віцебску (снежань 1826 – верасень 1841 гг.), суднаходныя (Паўднёва-Заходняя кампанія для суднаходства паміж Чорным і Балтыйскім марамі, кампанія для ўтрымання параходства па Дняпру і яго прытоках, параходнае таварыства па Заходняй Дзвіне і яе прытоках), прамысловыя (Бабруйскі цукровы завод, Беларускае таварыства мануфактурнай прамысловасці), страхавыя (агульнарасійскія таварыствы для страхавання пажыццёвых і іншых тэрміновых даходаў і грашовых капіталаў (1835 г.), узаемнага страхавання жывёлы (1839 г.), супрацьпажарнае таварыства (1835), Саламандра (1846 г.).

У навуковай літаратуры найбольш асветлены некаторыя аспекты стварэння і дзейнасці Беларускага вольнага эканамічнага таварыства, але аб іншых акцыянерных таварыствах адсутнічае дакладная інфармацыя з першакрыніцаў. Таму звернем увагу на малавывучаныя бакі стварэння вышэйзгаданых суднаходных і прамысловых акцыянерных таварыстваў.

Сенацкі ўказ ад 5. 03. 1824 г., пасля зацверджанага імператарам палажэння Камітэта міністраў, абвяшчаў аб стварэнні Паўднёва-Заходняй кампаніі для суднаходства паміж Чорным і Балтыйскім марамі [9, т. 39, № 29827, с. 201–203]. Сярод заснавальнікаў кампаніі адзначаліся як прадстаўнікі агульнаімперскай (шталмайстар, сапраўдны камергер, сенатар, князь Гагарын, адмірал, сенатар, граф М.С. Мардвінаў), так і мясцовай (сапраўдны стацкі саветнік В. Пуслоўскі, палкоўнік Сакер, мінскі губернскі маршал Зяновіч) эліты. Галоўная мэта заснавання расійскай Паўднёва-Заходняй кампаніі заключалася ў аблягчэнні руху транспарту па Дняпру, Нёману, Дзвіне і ўпадаючых у іх рэкаў, паляпшэнні збыту земляробчых і мануфактурных тавараў, павелічэнні гандлёвых абаротаў. Адкрыццё кампаніі планавалася пасля накаплення капітала памерам 150 тыс. руб. (у наяўнасці павінна было быць не менш паловы). Яна павінна была

дзейнічаць на галоўных шляхах Дняпроўскага, Нёманскага, Бярэзінскага басейнаў. Акцыянеры, якія ўносілі грошы яшчэ да зацвярджэння кампаніі, з часу ўзносу сродкаў атрымлівалі 5% штогод з унесенай сумы і наступных прыбыткаў, а іх грашовыя паступленні прылічваліся да іх капіталу [1]. Агульны сход акцыянераў расійскай Паўднёва-Заходняй суднаходнай кампаніі па прапанове адмірала М.С. Мардвінава 24. 04. 1824 і 27. 04. 1825 г. вырашыў да моманту назапашвання капіталу 150 тыс. руб. (300 акцый па 500 руб. асігнацыямі кожная) не будаваць суднаў, а капітал папаўняць за кошт 100 тыс. пудоў солі, падараванай Аляксандрам I кампаніі ў пазыку на 3 гады без плацяжу працэнтаў. Аперацыя па рэалізацыі солі была даручана членам таварыства памешчыкам В. Пуслоўскаму і А. Скірмунту, якім было дазволена забраць з крымскіх магізінаў 70 тыс. пудоў солі з гарантыяй пастаўкі нерухомымі маёнткамі (у В. Пуслоўскага да 22 тыс. душ, А. Скірмунта да 5 тыс. душ сялян мужчынскага пола). З агульнага капіталу акцыянернай кампаніі памерам 71 108 руб. за В. Пуслоўскім і А. Скірмунтам лічыліся 36 846 руб., і кіраўніцтва чакала ад іх яшчэ прыбытку памерам 9 221 руб. [4].

Паводле зацверджанага 5. 02. 1835 г. палажэння Камітэта міністраў бабруйскаму купцу Розінгу, які прыняў у таварыства пецярбургскага купца Эберта і аптэкара Штрауха, была прадастаўлены 10-гадовы прывілей на заснаванне і ўтрыманне па Дняпру і яго прытокам параходства для буксіроўкі суднаў з казёнными і прыватнымі грузамі. Аднак неўзабаве высветлілася, што магутнасцяў 2 параходаў (“Наследник” і “Константин” кожны па 50 конскіх сілаў) было недастаткова, таму паводле зацверджанага 8. 02. 1838 г. палажэння Камітэта міністраў памянутым асобам было дазволена арганізаваць акцыянерную кампанію (некалькі акцый на кошт казны) і прадоўжыць надалей прывілей дняпроўскага параходства па сканчэнні тэрміна яго дзеяння яшчэ на 4 гады. Устаўны капітал складаў 1 180 000 руб., ці 1180 акцый (кожная коштам па 1000 руб.). Пры падпісцы на акцыі спачатку трэба было ўнесці за кожную па 200 руб., а астатнія грошы – пазней па прызначэнні праўлення кампаніі, прыбытак меркавалася выдаваць акцыянерам штогод [2]. У адпаведнасці з зацверджаным 8. 02. 1838 г. палажэннем Камітэта міністраў, апублікаваным 9.03.1838 г., стваралася акцыянерная кампанія для ўтрымання

параходства па Дняпру і яго прытоках [9, т. 13–1, № 10959, с. 92–94, т. 13–2, № 11617, с. 201]. У 1839 г. Дняпроўская параходная кампанія пачала дзейнічаць [9, т. 14–1, № 12521, с. 618]. Для арганізацыі яе работы, у прыватнасці, буксіроўкі суднаў і перавозкі пасажыраў па Дняпру і яго прытокам паміж гарадамі Магілёвам і Крамянчугам 21. 02. 1858 г. быў зацверджаны ўстаў Дняпроўскага параходнага таварыства, якое павінна было мець капітал 200 тыс. руб. серабром (4 тыс. акцый па 50 руб. кожная) і дзейнічаць 25 год [9, т. 33–1, № 32798, с. 262–265]. 31.08.1860 г. вярхоўнай уладай быў санкцыяніраваны ўстаў акцыянернага параходнага таварыства па Заходняй Дзвіне і яе прытоках [7; 9, т. 35–2, № 36122, с. 87–90]. Параходная акцыянерная кампанія мусіла ажыццяўляць перавозкі пасажыраў і грузаў па Заходняй Дзвіне паміж гарадамі Рыгай і Белым [3].

У сферы прамысловасці акцыянерныя таварыствы ствараліся ў цукраварнай вытворчасці і ў галіне перапрацоўкі льну і пянькі. 10. 06. 1837 г. было абвешчана аб стварэнні таварыства для будаўніцтва ў Бабруйску цукровага завода [9, т. 12–1, № 10232, с. 317–318]. Праект арганізацыі Віленскай цукровай кампаніі праваліўся [9, т. 13-1, № 11068, с. 189–192; т. 23-1, № 22635, с. 632–633]. 29.09. 1839 г. было апублікавана зацверджанае імператарам 25.07. 1839 г. палажэнне Камітэта міністраў аб заснаванні Беларускага таварыства мануфактурнай прамысловасці льном і пянькой з першапачатковым капіталам 137 126 руб. серабром (120 акцый па 1142руб. серабром за кожную) [6; 9, т. 14-1, № 12573, с. 643–647].

У цэлым, з-за слабасці купецкіх і прамысловых капіталаў транспартныя і прамыслова-гандлёвыя акцыянерныя кампаніі на тэрыторыі Беларусі ў першай палове XIX ст. не атрымалі развіцця. Працэс стварэння падобных акцыянерных таварыстваў актывізаваўся ў другой палове XIX ст., і асабліва ў пачатку XX ст.

Выкарыстаная літаратура

1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Фонд 320. –. Воп 1. – Спр. 80 – Л. 1 адв. – 2 адв.

2. Там жа, Фонд 1297. – Воп. 1. – Спр. 10968. – Л.2, 5.

3. Там жа, Фонд 1297. – Воп. 1. – Спр. 16388. – Л. 8.

4. Там жа, Фонд 2001. – Воп. 1. – Спр. 63. – Л. 43, 44.

5. Об учреждении Белорусского общества мануфактурной промышленности льном и пенькой // Журнал мануфактур и торговли. – 1839. – Ч. 3. – № 10. – С. 1–10.
6. Об учреждении пароходного общества на р. Западной Двине и ее притоках. Устав акционерного пароходного общества // Журнал мануфактур и торговли. – 1860. – № 11. – С. 66–71.
7. Полное собрание законов Российской империи: собрание 1-е с 1649 по 12 декабря 1825 г.: в 45 т. – СПб.: Типография 2-го отделения собственной его императорского величества канцелярии, 1830.
8. Полное собрание законов Российской империи: собрание 2-е с 1825 по 1881 г.: в 55 т. – СПб.: Типография 2-го отделения собственной его императорского величества канцелярии, 1830–1862.
9. Список акционерных обществ и товариществ на паях по порядку учреждения. Сведения за 1799–1868 гг. // Ежегодник Министерства финансов. – СПб., 1869. – Вып. 1. – С. 308–315.
10. Функ, Я.И. Акционерное общество: история и теория (диалектика свободы) / Я.И. Функ, В.А. Михальченко, В.В. Хвалей. – Минск: Амалфея, 1999. – 608 с.
11. Шепелев, Л.Е. Акционерные компании в России / Л.Е. Шепелев. – Л.: Наука, Ленинградское отделение, 1973. – 347 с.

## САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЯ ПАЛІТЫКА ЦАРСКІХ УЛАД У БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX СТ.

Карпіевіч В.А.г. Мінск, ДУА “ Камандна-інжынерны
інстытут” МНС Рэспублікі Беларусь

Сацыяльна-палітычныя падзеі, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі, Літвы і Польшчы ў 40 – 50-я гг. XIX ст., у значнай ступені аказалі ўплыў на адносіны царскіх улад да гэтых зямель. Урад праводзіў тут асаблівую палітыку, якая павінна была замацаваць дадзеныя землі за імперыяй. Пасля паўстання 1863 – 1864 гг. у заходніх губернях было ўведзена ваеннае становішча, тут былі расквартэраваны ў вялікай колькасці войскі. Уся паўната ўлады належала Віленскаму генерал-губернатару. У краі дзейнічала забарона на стварэнне рознага роду аб’яднанняў і таварыстваў, нават тых, якія мелі мэтай аказанне дапамогі сельскагаспадарчым